Дзейныя асобы

# ЖЫЦЬ СУМЛЕННА І ПАМЯТАЦЬ...

## Такім быў наказ ветэрана

**Імя лётчыка-штурмавіка П. С. Старавойтава раней было мала вядомым, нават у адмысловай кнізе «Памяць. Гродна» пра героя — хіба ўпамінанне...**
**Супрацоўнікам нашай цэнтральнай гарадской бібліятэкі шмат чаго ўдалося вярнуць з забыцця.**



Нарадзіўся Піліп Сцяпанавіч у 1905 годзе ў вёсцы Блізняцы (сёння гэта Рагачоўскі раён Гомельскай вобласці), скончыў сем класаў і прафесійную школу, удзельнічаў у трох войнах: Грамадзянскай у Іспаніі, Савецка-фінскай і Вялікай Айчыннай... У 1933 годзе скончыў Адэскую школу пілотаў і пасля гэтага ўжо сам быў прызначаны камандзірам лётнай вучэльні ў горадзе Карасцень, якую ў першыя ж дні вайны эвакуіраваў у Свярдлоўск...

Адтуль — з просьбай адправіць на фронт — Піліп Сцяпанавіч звяртаўся асабіста да Сталіна: пісаў, што кадравы афіцэр, што не можа змірыцца з тым, што гінуць маладыя, неспрактыкаваныя хлопцы.

З ліпеня 1943-га маёр Старавойтаў — на франтах Вялікай Айчыннай, пасля стажыроўкі з лістапада гэтага ж года — камандзір 62-га штурмавога авіяцыйнага палка, які да лютага 1944-га здзейсніў 714 паспяховых вылетаў, у выніку чаго было знішчана і выведзена са строю 30 танкаў, 444 аўтамашыны, 128 гармат супрацьпаветранай абароны, 150 гармат зенітнай артылерыі і зенітных гармат, 65 мінамётаў, 80 чыгуначных вагонаў, каля 800 салдат і афіцэраў праціўніка, разбурана 20 бліндажоў, восем пераправаў, запалена і падарвана чатыры склады з гаручым і боепрыпасамі.

У адным з баёў самалёт Старавойтава быў падбіты, ахоплены полымем, аднак Піліпу Сцяпанавічу ўдалося прызямліцца — спланіраваць на сваю тэрыторыю, сесці бліз станцыі Лёзна. З кабіны яго, непрытомнага камандзіра, выцягнуў стралок-радыст. На іх шчасце, непадалёк быў медсанбат...

Пасля аказання дапамогі Старавойтаў адчуў сябе больш-менш нармальна і папрасіў адправіць яго на найбліжэйшы аэрадром, а ўжо адтуль (яшчэ раз адмовіўшыся ад шпіталізацыі) — у свой полк.

Лётчыкі, якія бачылі, што самалёт камандзіра збілі, ну, вядома ж, не чакалі ўбачыць яго жывым: сустракаць збіраліся ўсе...

І гэта — не адзін вось такі выпадак: падчас вайны Піліп Сцяпанавіч некалькі разоў быў паранены, па стане здароўя яго хацелі камісаваць, але ён вярнуўся ў строй і перамогу сустрэў у званні палкоўніка, намесніка камандзіра 233-й штурмавой авіяцыйнай дывізіі.

Пра Старавойтава ў сваіх ваенных успамінах «Над полем бою» двойчы Герой Савецкага Саюза (пасля — маршал авіяцыі) Яфімаў пісаў: «Лётчыкі і паветраныя стралкі, інжынерна-тэхнічны склад любілі свайго камандзіра... за адвагу і прастату. Ён заўсёды першым лятаў на баявыя заданні і хутка арыентаваўся ў становішчы... Часам ён рабіў па два, а то і па тры вылеты.... Камандзір у авіяцыі — найлепшы лётчык і найлепшы баец. Такім быў Старавойтаў, вакол якога заўсёды гуртавалася моладзь».



Піліп Сцяпанавіч узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны І ступені, Суворава ІІІ ступені, Чырвонай Зоркі і іншымі, васьмю медалямі.

...Напрыканцы жыцця перамяшчаўся на мыліцах, быў інвалідам І групы. Памёр у 1977 годзе.

У музеі воінскай славы СШ № 11 ёсць экспазіцыя, прысвечаная 62-му Гродзенскаму штурмавому авіяпалку. Там жа захоўваюцца асабістыя рэчы камандзіра, Ганаровага грамадзяніна горада — яго ваенны кіцель з ордэнскай планкай, фуражка, лётны шлем, кішэнны даведнік штурмана, медыцынская картка, кіёк, на які абапіраўся ў старасці... Іх перадалі музею дочкі героя.

У асабістым архіве пісьменніка Юрыя Бедзіка захоўваюцца здымкі. На адным з іх — дароўны надпіс: «Юра, памятай старога, будзь заўсёды сумленным. Ад ветэрана вайны Старавойтава. 26.12.76 г.».

**Інэса Ілюшына,**
*г. Гродна.*

Ёсць пытанне

# КАМУ ЗАСТАНЕЦЦА СПАДЧЫНА?

**«Мы з мужам — людзі немаладыя, маем двух сыноў, чатырох унукаў... Хацелі б скласці завяшчанне. Растлумачце, калі ласка, як гэта правільна зрабіць?»**
**Алена Мікалаеўна, Бабруйскі раён.**

Завяшчаннем прызнаецца волевыяўленне грамадзяніна па распараджэнні маёмасцю, якая яму належыць, на выпадак смерці. Гэта аднабаковая здзелка, якая ажыццяўляецца толькі асабіста і ўступае ў сілу толькі пасля смерці завяшчальніка.

Завяшчанне можа здзейсніць грамадзянін, які валодае дзеяздольнасцю ў поўным аб'ёме (то-бок дасягнуў паўналецця). Для гэтага неабходна звярнуцца ў натарыяльную кантору або ў натарыяльнае бюро да любога натарыуса, незалежна ад свайго месца жыхарства. Пры сабе неабходна мець дакумент, які сведчыць асобу, пры наяўнасці права на льготу па аплаце натарыяльнага тарыфу — дакумент, які сведчыць такое права (пенсіённае пасведчанне, пасведчанне інваліда І або ІІ групы). Пры гэтым дакументы, якія пацвярджаюць правы на маёмасць, не запатрабоўваюцца, паколькі завяшчаць можна не толькі тую маёмасць, якая ўжо належыць завяшчальніку, але і маёмасць, якая будзе набытай.

Пры складанні завяшчання грамадзянін не абмежаваны ў колькасці спадчыннікаў і мае права, паводле свайго меркавання, завяшчаць маёмасць любым асобам, якія і ўваходзяць, і не ўваходзяць у кола спадчыннікаў па законе, прызначаць спадчынніка, пазбавіць спадчыны аднаго, некалькіх або ўсіх спадчыннікаў па законе, а таксама ўключыць у завяшчанне іншыя распараджэнні, якія не супярэчаць заканадаўству.

Варта адзначыць, што, калі завяшчальнік ніяк не змяняе прадугледжаны законам парадак атрымання спадчыны (то-бок усю сваю маёмасць завяшчае спадчыннікам па законе ў роўных далях), у складанні завяшчання мэтазгоднасці няма.

Тэкст завяшчання павінен дакладна перадаваць волю завяшчальніка, быць выразным і зразумелым, не дапускаючы выразы, якія змяшчаюць супярэчнасці і розныя тлумачэнні. Невыкананне правіл аб пісьмовай форме завяшчання і яго сведчанні цягне несапраўднасць завяшчання. Натарыяльна засведчанае завяшчанне павінна быць напісана завяшчальнікам уласнаручна ў двух экзэмплярах альбо запісана з яго слоў натарыусам у прысутнасці сведкі (у такім выпадку ён павінен мець пры сабе дакумент, які сведчыць асобу).

Грамадзянскім заканадаўствам вызначаны асобы, якія не могуць быць сведкамі: натарыус або іншая асоба, якая сведчыць завяшчанне; асоба, на карысць якой складзена завяшчанне або зроблена завяшчальная адмова, муж (жонка) такой асобы, яе дзеці, бацькі, унукі і праўнукі; спадчыннікі па завяшчанні або па законе; грамадзяне, якія не валодаюць поўнай дзеяздольнасцю; непісьменныя; асобы, якія маюць судзімасць за дачу ілжывых паказанняў; грамадзяне з фізічнымі недахопамі, якія не дазваляюць ім у поўнай меры ўсвядоміць сутнасць таго, што адбываецца; асобы, якія не валодаюць у дастатковай ступені мовай (за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўствам).

Падчас складання завяшчання таксама неабходна памятаць, што свабода завяшчання абмяжоўваецца правіламі аб абавязковай долі ў спадчыне, аб недапушчэнні ўскладання на асоб, назначаных спадчыннікамі ў завяшчанні, абавязку ў сваю чаргу пэўным чынам распарадзіцца завешчанай маёмасцю на выпадак іх смерці, а таксама ўключэння ў завяшчанне супрацьпраўных або невыканальных для спадчынніка з-за аб'ектыўных прычын умоў яго паводзін для атрымання спадчыны.

Дзеючае заканадаўства не абмяжоўвае колькасць завяшчанняў, якія можа скласці грамадзянін, не абмяжоўвае завяшчальніка і ў праве валодання, карыстання і распараджэння завешчанай маёмасцю пры жыцці. Завяшчальнік мае права ў любы час, без тлумачэння прычын, адмяніць зробленае ім завяшчанне ў цэлым альбо змяніць яго, складзіць новае. Аднак для гэтага таксама неабходна звярнуцца да натарыуса (то-бок немагчыма адмяніць завяшчанне, проста перакрэсліўшы ці парваўшы свой экзэмпляр).

Неабходна адзначыць, што завяшчанне — гэта эфектыўны інструмент, з дапамогай якога завяшчальнік можа змяніць прадугледжаны законам парадак атрымання спадчыны, даючы завяшчальніку магчымасць рэалізаваць правамоцтва па распараджэнні сваёй маёмасцю на выпадак смерці, выходзячы з волевыяўлення.

**Наталля ЖУКАВА,**
**натарыус Мінскай гарадской натарыяльнай акругі.**

Даты

# РАМАН, ЯКІ ТРЭБА ПЕРАЧЫТВАЦЬ



**Сёлета, 3 ліпеня, мы будзем святкаваць 80-годдзе вызвалення Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэта, як мне здаецца, добрая нагода ўспомніць самім і дзецям расказаць пра падзеі тых часоў: жыццё сталіцы пад акупацыяй, Мінскае падполле, подзвігі людзей, якія набліжалі дзень, калі горад змог свабодна ўздыхнуць, распачаць сваё аднаўленне і абнаўленне.**

У гэтай сувязі я хачу згадаць раман Івана Мележа «Мінскі напрамак». У ім народны пісьменнік Беларусі здолеў расказаць пра гераічнае і трагічнае ў нашай гісторыі, уславіць подзвіг народа.

Вельмі спадзяюся, што ў многіх бібліятэках (у тым ліку хатніх) ёсць гэты твор (а добра было б, каб з'явіўся яшчэ і мастацкі фільм!), што многім зараз захочацца прачытаць ці яшчэ раз перачытаць яго. На маю думку, для нас, нашчадкаў славутых дзядоў і бацькоў, гэта стала б яркім прыкладам таго, якімі прынцыпамі трэба кіравацца, каб захаваць мір.

**Вадзім Мохаў,**
*г. Мінск.*

Усмешачку

# «Ой, бяжыць, бяжыць дарога, Кліча вёску ў выхадны...»

**«Здаўна чытаю «родную газету на роднай мове», здаўна што-нішто пішу, — у першых радках свайго ліста паведамляе спадар Іван Астроўскі з Мінска. — Мае прыпеўкі друкаваліся ў рубрыцы «На прызбе ў Алёны», але ж гэта было даўно... З тых часоў з'явілася безліч новых. Дасылаю толькі «жменьку» — на пачатак новай вясны і чарговага дачнага сезона.**

*Невялічкая прыпеўка —*
*Але ж сілы ў яе...*
*Хоць прыпеўка не гарэлка,*
*А настрою прыдае.*

* * *

*На базары ўсё чужое,*
*А на лецішчы — свае.*
*Любім дачу мы за тое,*
*Што працуем і пяём.*

* * *

*Каб быў трактар ці канёк,*
*Бульбу б тачкай не валок,*
*Пад лапату не садзіў*
*І гарбатым не хадзіў.*

* * *

*На палях ужо даўно*
*Не валяецца яно,*
*Пакуль трактар заарэ, —*
*Дачнік шуфлем падбярэ.*

* * *

*Ой, бяжыць, бяжыць дарога,*
*Кліча вёска ў выхадны.*
*Цешча лічыць — на падмогу.*
*Зяць мяркуе — на бліны.*

* * *

*Не дапетру, як тут быць,*
*Сталі ўсе мяне прасіць:*
*Жонка з цешчай —*
*штосьць зрабіць,*
*Цесць са шваграм — піва піць.*

* * *

*Наліваў сусед мне з чвэрці —*
*Думаў я — канец прыйшоў:*
*Сабіраўся ўжо памерці,*
*Але выручыў расол!*

* * *

*Не чакаем дапамогі*
*Мы, старэнькія грыбы.*
*Калі воўка кормяць ногі,*
*Нас — нажытыя гарбы.*

* * *

*Збудаваў сабе я дачу*
*Аж у чорта на рагах.*
*І жыцця за ёй не бачу,*
*І ўжо кінуць — аніяк.*

**Усім здароўя і добрых ураджаяў!**